УДК 908

# ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНЫ СТАН КРАЯЗНАЎСТВА Ў ЛУНІНЕЦКІМ РАЁНЕ

***Вадзім Жылко***
*Лунінец, Беларусь*
vadim_ne67@mail.ru

У дакладзе ўтрымліваюцца звесткі пра шматгадовую дзейнасць краязнаўцаў у Лунінецкім раёне Брэсцкай вобласці, пра выданні, якія яны выпусцілі. Ахарактарызаваны некаторыя асаблівасці краязнаўчай працы ў гэтым рэгіёне.

***Ключавыя словы: Лунінецкі раён, Брэсцкая вобласць, Палессе, краязнаўства, Лунінецкія краязнаўчыя чытанні, Лунінецкі сшытак***

# HISTORY AND CURRENT STATE OF LOCAL LORE IN LUNINETS DISTRICT

***Vadim V. Zhilko***
*Luninets, Belarus*

The report contains information on the long-term activities of local historians in the Luninets district of the Brest region, and their publications. Some features of local history work in this region are characterized.

***Keywords: Luninets district, Brest region, Polesie, local history, Luninets local history reading, Luninets notebook***

Лунінецкі раён Брэсцкай вобласці - адзін з найбуйнейшых па плошчы ў Беларусі, размешчаны на мяжы некалькіх абласцей, гістарычна-этнаграфічных і культурных рэгіёнаў. Таму Лунінецкі край не адно стагоддзе прыцягвае ўвагу этнографаў, фалькларыстаў, лінгвістаў. Можна прыгадаць даследаванні тут у XIX стагоддзі Рамуальда Зянькевіча, Адама Кіркора, у пачатку XX стагоддзя - Яўхіма Карскага, Аляксандра Сержпутоўскага, Ісаака Сербава. У 2005 годзе дзякуючы лунінецкаму фундатару была перавыдадзена кніга І.Сербава «Вічынскія паляне. Матэрыяльная культура. Этнаграфічны нарыс Беларускага Палесся» 1928 года.

Яшчэ раней, у апошняй чвэрці XIX стагоддзя, на Лунінеччыне была створана рукапісная брашура «Мова. Частка першая. Св(ятар) Платон Ціхановіч. М. Лунін. 31 студзеня 1875», дзе прадстаўлены мясцовыя гаворкі.

У першай трэці XX стагоддзя на Лунінеччыне плённа працавалі польскія этнографы і фатографы Юзаф Абрэмбскі, Станіслаў Бохніг, этнолаг Казімір Машынскі, украінскі фалькларыст і музыказнаўца Філарэт Калеса, заснавальнік Пінскага музея Раман Гарашкевіч і інш. Некаторыя з сабраных у той час матэрыялаў праз шмат гадоў далі магчымасць выдаць альбом «Палессе ў фотаздымках 20-30-х гадоў» (Варшава, 1997). А ў красавіку 2017 года лунінчане Іван і Ларыса Панасюкі апублікавалі электронны варыянт брашуры «Палессе. З кнігі Юзафа Абрэмбскага».

На Лунінеччыне вёў даследаванні вядомы лінгвіст Вячаслаў Вярэніч. У 2009 годзе Заходнепалескае навукова-краязнаўчае таварыства «Загароддзе» выдала асобнай кнігай яго «Палескі архіў».

Можна адзначыць і іншых навукоўцаў, так ці інакш звязаных з Лунінеччынай. Вядомы ў Беларусі фалькларыст Анатоль Фядосік у 1949-1955 гадах быў дырэктарам Сінкевіцкай школы. Лунінецкі настаўнік і краязнавец Георгій Вайндрах (1925-1992) з 1968 года працаваў у Брэсцкім педінстытуце, стаў кандыдатам гістарычных навук. Многія публікацыі і даследаванні Г.Вайндраха скарыстаў і развіў яго паслядоўнік Мікалай Калінковіч (1950-1990), аўтар каля дзясятка кніг, сярод якіх два выданні «Лунінец» (1981, разам з В.Літвінчуком; 1990) і кніга «Палескія дні Аляксандра Блока» (1985). Ураджэнец Лунінца Ігар Цітовіч абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Краязнаўчы рух на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921-1939)» [4].

На Лунінеччыне працавалі навукоўцы акадэмічнага Інстытута этнаграфіі, мастацтвазнаўства і фальклору, шэрагу ВНУ, а студэнцкія экспедыцыі з БДПУ імя М.Танка на чале з дацэнтам Алесем Лозкам сабралі матэрыялы для двухтомніка «Фальклор Лунінеччыны».

У 1995 годзе выйшла грунтоўнае выданне «Памяць. Лунінецкі раён» - калектыўная праца навукоўцаў, краязнаўцаў, журналістаў [10].

Краязнаўства на Лунінеччыне мае свае шматгадовыя традыцыі. Так, у 1960-я гады была напісана «Гісторыя Кажан-Гарадка» Івана Ленінца, калгаснага бухгалтара па прафесіі: каля 700 старонак ахоплівалі перыяд ад старажытных часоў да сярэдзіны XX стагоддзя. На жаль, пасля смерці аўтара сляды самвыдатаўскай «Гісторыі» згубіліся.

Шмат дзесяцігоддзяў плённа даследаваў гісторыю Лунінеччыны Леў Коласаў (1932-2021). У кола яго інтарэсаў уваходзілі вывучэнне зніклых або рэдкіх прафесій, гісторыі філатэліі, пошты і чыгункі, будынкаў і вуліц Лунінца і г.д. Л.Коласаў друкаваўся ў выданнях Беларусі, Расіі, Польшчы, Германіі.

Васіль Туміловіч фактычна «ўзняў з нябыту» вядомую ў 1930-я гады лунінецкую праваслаўную пісьменніцу Софію Прорвіч, сабраў яе творы, аднавіў біяграфію. Яго пяру таксама належаць кнігі «Тапаніміка Кажан-Гарадка і яго зямель», «З фальклорных крыніц Кажан-Гарадка», «Кажан-Гарадок 500-гадовы. Гістарычныя даследаванні», «Фальклор Камянецкага раёна», «Исторический очерк Новицкович и деревень сельсовета».

Іван Панасюк выдаў ў якасці аўтара, суаўтара, укладальніка каля дваццаці кніг, сярод якіх «Лунінецкі раён: Чырвоны сшытак. Прырода і ахоўваемыя тэрыторыі», «Велута», «Остромечево и «остромычивци», «Урочышчы і мясціны вакол Валуты», «Интернат ты наш, интернатушка», «Навасёлкі лунінецкія», «Письма командиров», «Гонар і памяць Зямлі Лунінецкай», «От Остромечино до Остромечево» і інш.

Таццяна Канапацкая выдала сем краязнаўчых зборнікаў «Лунінецкая памяць» (2006, 2007, 2008, 2010, 2013, 2017 і 2020 гады), ладзіць штогадовыя краязнаўчыя сустрэчы памяці Мікалая Калінковіча, канферэнцыі памяці Мікалая Анцукевіча (1892-1971) - педагога і фальклярыста, які ў 1926 годзе ў Лунінцы пераклаў на рускую мову «Слово о полку Игореве».

Сцяпан Нефідовіч выдаў брашуры «Іх яднала дружба», «Ад Цны да Случы» (пра рэкі Лунінеччыны), «Балоты Лунінеччыны: ад народзінаў да скону», «Анамастыка вёскі Лахаўка Лунінецкага раёна» і інш.

У 2013 годзе выйшла брашура Міколы Ільючыка «История Евангельской церкви. Деревня Богдановка Лунинецкого района».

Святаслаў Яначкін адшукаў і сістэматызаваў шэраг старых карт і планаў Лунінца. Сярод выдадзеных ім прац - «Лунінецкая картаграфія і назвы вуліц Лунінца ў гістарычнай перспектыве (канец XIX - першая палова XX ст.)», «Стагоддзе кіно ў Лунінцы (1920-2020)», «Столетие присвоения Лунинцу статуса города (1919-2019)», «Когда Лунинец был Лондоном» (пра сацыялістычны рух на Палессі ў 1920-30-я гады), «Из истории Лунинецкого местного самоуправления (1842-1939)», «Лунинецкие предания седины глубокой» (пра Лунінеччыну ў архіўных дакументах XVI ст.).

Можна згадаць таксама даследаванні і публікацыі Яўгена Хвастова, Ларысы Панасюк, Алены Нямчэня, Ларысы Грамыка, Галіны Даніловіч, Аляксандра Яраховіча, Ліліі Віўдзенка, Дзіяны Сладзінскай, Ганны Дземідовіч і іншых, а таксама шэрагу навучэнцаў і педагогаў Лунінеччыны.

Лунінецкія краязнаўцы штогод прымаюць удзел ў навуковых форумах рознага ўзроўню, друкуюцца ў выніковых зборніках гэтых канферэнцый. Даклады Васіля Туміловіча, Вадзіма Жылко, Льва Коласава прагучалі ў 1999 годзе ў Пінску і Іванаве на міжнароднай канферэнцыі «Палессе - скрыжаванне культур і часу» [5]. Васіль Туміловіч у 1998-2002 гадах прымаў удзел у V-VIII Свята-Еўфрасіннеўскіх чытаннях у Мінску з дакладамі пра пісьменніцу С.Прорвіч і рэнесансныя з'явы заходнебеларускай праваслаўнай літаратуры. На Міжнароднай канферэнцыі «1941 год на Беларусі», якую праводзіў 25-26.05.2001 Мінскі міжнародны адукацыйны цэнтр імя Й.Рау, быў зроблены даклад аўтара гэтых радкоў і В.Туміловіча «Лунінеччына паміж адступленнем савецкіх войск і нямецкай акупацыяй: крызіс улады і пачатак калабаранцкіх настрояў», а на Міжнароднай канферэнцыі «Палацава-паркавае мастацтва Брэстчыны. Гісторыя, стан, перспектывы» (Брэст-Ляхавічы, 13-15.08.2001) прагучалі даклады В.Жылко «Гістарычныя ландшафты Лунінца ў сваім развіцці» і В.Туміловіча «Фарміраванне і сучасны стан гістарычнага ландшафту Кажан-Гарадка». Аўтар гэтага паведамлення ўдзельнічаў у навукова-практычных канферэнцыях «Гісторыя, якой няма ў падручніках» (Мінск, 27.04.2002), «Гістарычныя цэнтры гарадоў Беларусі» (Мінск, 28.11.2002, арганізатар - Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры) [3, с. 135-138], «Навечна ў памяці народнай» (Мінск, 14.04.2004, арганізатар той жа) [9, с. 112-114].

У 2008, 2012, 2015 і 2018 годзе В.Жылко і В.Туміловіч выступалі на чатырох міжнародных канферэнцыях «Берасцейскія кнігазборы» ў Брэсце з дакладамі «Бібліятэкі на Лунінеччыне ад узнікнення (XVI ст.) да 1940-х гадоў», «Развитие библиотек и контроль государства за распространением периодических изданий в Лунинецком повете в 1921-39 годах», «Самвыдат на Лунінеччыне», «Новыя імёны для «Літаратурнай карты Берасцейшчыны», «Падпольныя выданні 1941-1944 гадоў на Брэстчыне», «Літаратурная геаграфія Лунінецкага раёна» [1].

На гэтай жа канферэнцыі 2012 года пінскі даследчык Аляксандр Ільін (1956-2020) прадставіў даклад «Бібліятэка і архіў Дзятлавіцкага Спаса-Праабражэнскага манастыра», а пазней асобнымі брашурамі ў Лунінцы выйшлі яго даследаванні «Дятловичский Свято-Преображенский монастырь» і «Архимандрит Маркиан (Пётр Платонович) - писатель, лекарь, благотворитель и церковный деятель». 29-30 мая 2019 года ў Пінску прайшла V міжнародная навуковая канферэнцыя «Бяркоўскія чытанні. Кніжная культура ў кантэксце міжнародных кантактаў». У рамках яе Вадзім Жылко выступіў з дакладам «Краязнаўчая

дзейнасць у Лунінецкім раёне», Аляксандр Ільын прадставіў даклад «Фольклорная экспедиция К.Мошинского и Ф.Колессы на Лунинетчине и Столинщине» [2].

У Мінску 12-13 сакавіка 2020 года адбыўся I Рэспубліканскі краязнаўчы форум Беларусі. У секцыі «Краязнаўства ў сістэме навукова-даследчай працы» Надзея Цяльпук выступіла з дакладам «Каравайны абрад Лунінеччыны», а Вадзім Жылко - «Краязнаўчы рух у Лунінецкім раёне». У секцыі «Краязнаўства ў вучэбна-выхаваўчым працэсе ўстаноў адукацыі» Галіна Антановіч прадставіла даклад «Фарміраванне грамадзянска-патрыятычных якасцей навучэнцаў сродкамі краязнаўчай дзейнасці», Дзіяна Сладзінская - «Использование краеведческого компонента на уроках и во внеурочное время». У секцыі «Асоба ў краязнаўстве: з гісторыі біяграфій беларускіх краязнаўцаў» Таццяна Канапацкая выступіла з дакладам «Всё сущее увековечить…» Памяці Мікалая Калінковіча, які першым паставіў лунінецкае краязнаўства на навуковую аснову». На канферэнцыі школьнікаў «Пазашкольнае краязнаўства: вопыт рэгіёнаў» Ягор Скрыбка прадставіў даклад «История Лунинетчины в археологических памятниках и находках».У час форуму журы конкурсу краязнаўчай літаратуры ўзнагародзіла за перамогі ў асобных намінацыях: Івана Панасюка - за кнігу «От Остромечино до Остромечево», Вадзіма Жылко - за ўкладанне зборнікаў «Краязнаўчымі шляхамі Лунінеччыны», Таццяну Канапацкую - за серыю зборнікаў «Лунінецкая памяць», Лунінецкі райвыканкам - за выданне кнігі «Милая малая родина, вечная наша любовь», упраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Лунінецкага райвыканкама - за кнігу «Служба неравнодушных людей».

Краязнаўчыя матэрыялы пастаянна друкаваліся на старонках мясцовых газет «Лунінецкія навіны», «Информ-прогулка», «Газета па-лунінецкі», у «Краязнаўчай газеце», абласным альманаху «Жырандоля» і інш. У 2006 годзе аўтарам гэтых радкоў і Нінай Трэгубавай была створана праграма школьнага спецкурсу «Лунінеччыназнаўства» [6, с. 136-148].

Да заслуг мясцовых гісторыкаў і краязнаўцаў можна аднесці праведзеныя ў 2001-2005, 2009-2012 і 2017-2021 гадах чатырнаццаць Лунінецкіх краязнаўчых чытанняў. Праходзілі яны фактычна на грамадскіх пачатках, як і выдаваліся зборнікі дакладаў - «Лунінецкія сшыткі» (на сёння выйшла 20 нумароў, а таксама 13 спецвыпускаў і 4 дадаткі) [8].

Лунінецкая цэнтральная раённая бібліятэка, якая ў апошнія гады ладзіць гэтыя чытанні, выпусціла таксама чатыры зборнікі «Краязнаўчымі шляхамі Лунінеччыны» (2017, 2019, 2020 і 2021 гады) [7], шэраг іншых краязнаўчых брашур: Льва Коласава - «Остановись, мгновенье! Послевоенный Лунинец на фотоснимках 1940-70-х годов» (2018), «Исторические планы города Лунинца» (2019), «Тайны старых писем» (2020, сумесна з Карстэнам Альслебенам), Святаслава Яначкіна - «Стагоддзе кіно ў Лунінцы» (2020) і інш.

У 2017 годзе ў бібліятэцы была створана «Літаратурная карта Лунінеччыны» (дзе сабрана каля 250 прозвішчаў літаратараў, біябібліяграфічныя даведкі пра іх), а ў 2019 годзе - заснавана Лунінецкае краязнаўчае таварыства. У анлайн-фармаце ў 2020 годзе былі адзначаны стогадовыя юбілеі кіно ў Лунінцы і Андрэя Макаёнка (знакаміты драматург быў звязаны з Лунінеччынай). Шэраг экскурсій і краязнаўчых матэрыялаў змешчаны на ютуб-канале бібліятэкі.

У зборніку «Бібліяпанарама №22» Брэсцкай абласной бібліятэкі змешчаны артыкул намесніцы дырэктара Лунінецкай РЦБС Валянціны Яфрэмавай «Бібліятэчны краязнаўчы турызм». У XXVIII рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка - асяродак нацыянальнай культуры» дыпломам 3-й ступені ў намінацыі «За пошукавую і даследчую працу» адзначана Лунінская сельская бібліятэка, якая стварыла электронны рэсурс пра земляка-пісьменніка Мікалая Еляневускага. Падзякай абласнога ўпраўлення культуры адзначаны інфармацыйны рэсурс Лунінецкай РЦБС «Літаратурная карта Лунінеччыны».

У VI рэспубліканскім конкурсе «Библиотека - центр духовного просвещения и воспитания» ў намінацыі «История Православия родного края» першае месца заняла Лунінецкая цэнтральная раённая бібліятэка, якая стварыла электронны рэсурс «Утраченная святыня» пра Навапячэрскі Дзятлавіцкі Праабражэнскі мужчынскі манастыр (XVI-XIX стагоддзі).

У красавіку 2021 года Лунінецкая РЦБС прыняла ўдзел у міжнароднай анлайн-канферэнцыі «Страноведение. Краеведение», арганізаванай у Маскве. Дырэктар ЛРЦБС Алена Кішкевіч выступіла з дакладам «Практика создания краеведческих пространств в библиотеках», распавёўшы пра міні-музеі бібліятэк у вёсках Лобча, Дрэбск, Люшча, Любань.

У ліпені 2021 года Лунінецкая РЦБС прыняла ўдзел у міжрэгіянальным бібліятэчным фэсце ў Баранавіцкім раёне, дзе была азначана дыпломам пераможцы ў намінацыі «Бібліятэка - цэнтр краязнаўства». У гэтым жа годзе яна атрымала падзяку ўпраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама за падрыхтоўку краязнаўчых матэрыялаў да 100-годдзя кіно ў Лунінцы.

У Палескім універсітэце ў Пінску 20 мая 2021 года адбыўся міжнародны круглы стол памяці Аляксандра Ільіна, дзе з дакладам «Аляксандр Ільін: «лунінецкія старонкі» творчасці» выступіў Вадзім Жылко.

Даследчая і краязнаўчая работа на Лунінеччыне вядзецца пры адсутнасці рэгіянальных навуковых ці вышэйшых навучальных установ, таму асноўная стаўка робіцца на намаганні грамадскасці. Мясцовым гісторыкам і краязнаўцам ўдалося абагульніць вынікі сваёй працы шляхам выдання дзясяткаў краязнаўчых зборнікаў, кніг і брашур.


1. Берасцейскія кнігазборы: Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання», Брэст, 30-31 кастрычніка 2008 года. Брэст, 2010. С. 208-215; Берасцейскія кнігазборыю – Брэст, 2013. С. 256-265; Берасцейскія кнігазборы: Матэрыялы III міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання», Брэст, 22-25 верасня 2015 года. Мінск, 2016. С. 379-387; Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання. Матэрыялы IV міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Брэст, 22-25 мая 2018 года. Брэст, 2019. С. 300-312.
2. Белорусское Полесье как историко-культурный феномен: Материалы международного научного семинара, Пинск, 29 мая 2019. Москва: Наука, 2019. 172 с.
3. Гістарычныя цэнтры гарадоў Беларусі: Матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Мінск, 28 лістапада 2002 года. Каштоўнасці мінуўшчыны. №6. Мінск: Знамение, 2003. С. 135-138.
4. Жылко В. Краязнаўчая справа на Лунінеччыне. Лунінец, 2005. 12 с.
5. Загароддзе-2: Матэрыялы навукова-краязнаўчай канферэнцыі «Палессе - скрыжаванне культур і часу», 25-27 верасня 1999 года. Мінск: Тэхналогія, 2000. 210 с.
6. Краязнаўчая адукацыя і грамадзянскае выхаванне. Мінск: БДПУ імя М. Танка, 2006. С. 136-148.
7. Краязнаўчымі шляхамі Лунінеччыны. Лунінец, 2017. 48 с.; Краязнаўчымі шляхамі Лунінеччыны-2. Лунінец, 2019. 72 с.; Краязнаўчымі шляхамі Лунінеччыны-3. Лунінец, 2020. 40 с.; Краязнаўчымі шляхамі Лунінеччыны-4. Лунінец, 2021. 52 с.
8. Лунінецкі сшытак. №№1-20. - Лунінец, 2002-2020.
9. Навечна ў памяці народнай: Матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Мінск, 14 красавіка 2004 года. Каштоўнасці мінуўшчыны. №8. Мінск: Беларускі фонд культуры, 2005. С. 112-114.
10. Памяць. Лунінецкі раён. Мінск: Беларусь, 1995. 720 с.